ЭКАНОМІКА І АРГАНІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ

УДК 631.16 : 338.5

В. Р. КРАСТОЎСКІ, Т. А. КРЫЛОВІЧ

ЦЭНАВАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ЭКВІВАЛЕНТНАСЦІ АБМЕНУ

За апошняе дзесяцігоддзе здзейснена сістэма арганізацыйна-эканамічных мер, накіраваных на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння сельскагаспадарчай вытворчасці [1, 2]. За перыяд з 1980 г. асноўныя вытворчыя фонды сельскагаспадарчага прызначэння ўзраслі ў 2 разы і на пачатак 1990 г. у грамадскім сектары рэспублікі склалі 16,8 млрд. руб. Палепшылася забеспячэнне гаспадарак мінеральнымі ўгнаеннямі, гаруча-змазачнымі матэрыяламі і інш.

Сярэднегадавая вартасць нарміраваных абаротных сродкаў з разліку на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў павысілася з 42,5 тыс. руб. у 1981 г. да 82,6 тыс. руб. у 1989 г. З іх на сродкі прамысловай вытворчасці прыпадае 31,1%. Аднак забеспячэнне сельскай гаспадаркі вытворчымі фондамі ва ўсе гады адбывалася больш высокімі тэмпамі, чым рост валавой прадукцыі. Як вынік, фондааддача зніжалася, матэрыяльныя затраты ў структуры сабекошту раслі. Напрыклад, з разліку на 1 руб. асноўных вытворчых фондаў выраблена валавой прадукцыі ў 1980 г. 0,7 руб., у 1985 і 1986 гг.— 0,66, у 1987 г.— 0,68, у 1988 г.— 0,57, у 1989 г.— 0,56 руб.

Гэта разам з недастаткова высокім узроўнем выкарыстання асноўных вытворчых фондаў абумоўлівалася павышэннем іх вартасці. Згодна з разліковымі данымі, індэкс агульнага падаражання машын і абсталявання за мінулыя тры пяцігодкі склаў прыкладна 1,33. І калі ў 1987 г. гэта выклікала падаражанне на 948,8 млн. руб., то ў 1989 г. па сельскай гаспадарцы рэспублікі яно склала 1230 млн. руб. Зробленая пераацэнка фондаў 1972 г. павялічыла вартасць будынкаў, якія існуюць да гэтага часу, на 18,1%, збудаванняў — на 9,9, перадатачных прыбораў — на 16%, або ў абсалютным выражэнні на 360 млн. руб. Павышэнне каштарыснай вартасці будаўніча-мантажных работ у 1983 г. па галіне сельскай гаспадаркі прыкладна на 18% прывяло да падаражання аб'ектаў вытворчага прызначэння за перыяд з 1984 па 1989 г. больш чым на 400 млн. руб. У апошнія гады высокімі тэмпамі адбываецца падаражанне прамысловай прадукцыі. У 1989 г. у параўнанні з 1988 г. вартасць сельскагаспадарчых машын і абсталявання для раслінаводства ўзрасла на 8,9, трактароў — на 6,7, аўтамабіляў — на 13,8%. Змяненне індэксу цэн толькі па трох названых вышэй групах сродкаў механізацыі ў сумарным падліку склала 37,5 млн. руб.

Пастаянна павышаецца і вартасць матэрыяльных рэсурсаў, якія выступаюць у сельскагаспадарчай вытворчасці ў выглядзе абаротных фондаў, а затым апасродкавана ў вытворчых затратах. Напрыклад, з 1983 г. у сярэднім на 32% павышана вартасць 1 т дзеючага рэчыва мінеральных угнаенняў, на 50% — гаруча-змазачных матэрыялаў. З 1987 г. адменены датацыі з бюджэту, накіраваныя на кампенсаванне розніцы паміж аптовымі цэнамі для прамысловасці і сельскай гаспадаркі на мінеральныя ўгнаенні, тэхніку. Толькі за апошнія два гады вартасць мінеральных угнаенняў узрасла на 7,3%, у 1990 г.— яшчэ на 10,1%. У вы-

ніку гэтага матэрыяльныя затраты ў структуры сабекошту сельскагаспадарчай прадукцыі за аналізуемы перыяд павялічыліся на 22,4%. Па ўсіх відах дзейнасці яны склалі ў 1989 г. 57,8%, па раслінаводству — 50,1, па жывёлагадоўлі — 65%. Калі ўсе матэрыяльныя затраты прыняць за 100%, то ў раслінаводстве на рэсурсы сельскагаспадарчага паходжання прыпадае 45,5%, прамысловага — 45,6%; 8,9% складаюць паслугі. Па галіне жывёлагадоўлі гэтыя паказчыкі складаюць адпаведна 92,7, 6 і 1,3%.

Аналіз перыядычнасці змянення цэн на прадукцыю прамысловай вытворчасці і закупачных цэн сведчыць пра тое, што мерапрыемствы ў галіне іх удасканальвання здзяйсняліся некомплексна. У 1967 і 1982 гг. пераглядаліся аптовыя цэны ў прамысловасці, у 1956 г. — тарыфы на чыгуначным транспарце. З 1955 г. найбольш актыўна праводзілася ўдасканальванне закупачных цэн. Хоць яны і ўзраслі за гэты перыяд у 4,6 раза, але ўзгадненне іх з аптовымі цэнамі прамысловасці не праводзілася. Таму адпускная цана сельскай гаспадарцы тэхнікі, мінеральных угнаенняў, электраэнергіі і нават камбікармоў, асновай якіх з'яўляецца прадукцыя сельскай гаспадаркі, кампенсавалася датацыямі з бюджэту. Напрыклад, увядзенне новых аптовых цэн на тэхніку ў 1967 г. патрабавала дадатковых фінансавых сродкаў у 1987 г. у суме 126,8 млн. руб., кампенсаванне розніцы ў цэнах на ўгнаенні — 192,6 млн. руб.

Гэтаму шмат у чым садзейнічала існуючая практыка цэнтралізаванага планавання народнай гаспадаркі. Гарантам прызнання грамадска неабходных затрат выступаў план, даведзены зверху. Адбываўся штучны адрыў практыкі гаспадарчага кіравання ад аб'ектыўных прынцыпаў законаў таварнай вытворчасці і перш за ўсё ад закону вартасці. Дыскусіі па цэнаўтварэнні вяліся вакол таго, што разумець пад грамадска неабходнымі затратамі і як іх колькасна вымяраць. Разыходжанне з аб'ектыўнымі эканамічнымі ўмовамі прывяло да недахопаў у цэнаўтварэнні: праводзілася частковае ўдасканаленне сістэмы цэн, а не радыкальная іх рэформа.

Комплексны перагляд цэн — аптовых на прадукцыю прамысловай вытворчасці, закупачных на сельскагаспадарчую, аптовых на прадукцыю перапрацоўчых галін — на адзінай метадычнай аснове дазволіць максімальна ліквідаваць існуючыя перакосы і дыспрапорцыі. Гэта ў першую чаргу аргументуецца тым, што пры пераглядзе закупачных цэн вызначаны ўзровень сярэдніх грамадска неабходных затрат на вытворчасць прадукцыі з улікам наступнага павелічэння аптовых цэн першай сферы аграпрамысловага комплексу і тарыфаў на паслугі. Паводле разлікаў, будуць кампенсаваны закупачнай цаной павышэнне аптовых цэн і тарыфаў, аднесеных на сабекошт сельскагаспадарчай прадукцыі, у грамадскім сектары рэспублікі на суму 3,18 млрд. руб., з іх падаражанне дызельнага паліва — 134, мінеральных угнаенняў, ядахімікатаў — 172,4, запасных частак да трактароў — 41,6, аўтамабіляў — 28,5, сельгасмашын — 57,9 млн. руб. Для дасягнення эквівалентнага абмену паміж прамысловасцю і сельскай гаспадаркай размеры кампенсацыі падаражанняў па відах прадукцыі і галінах розныя (табл. 1).

Увядзенне новых закупачных цэн на збожжа з ураджаю 1990 г., а таксама на прыбаўленне па масе буйной рагатай жывёлы, свіней, авечак, птушак з кастрычніка 1990 г., на малако, воўну — са студзеня 1991 г. павінна аднавіць эквівалентнасць абмену паміж прамысловасцю і сельскай гаспадаркай. Абмен аднолькавымі вартасцямі будзе трансфармаваны ў цэны вытворчасці і забяспечыцца «бягучай» цэнавай збалансаванасцю. Аднак радыкальная рэформа закупачных цэн, ліквідуючы дыспрапорцыі з цэнамі на прадукцыю прамысловай вытворчасці, прывядзе да іншай неадпаведнасці.

Па-першае, забеспячэнне рынку таварамі можа быць дасягнута пры поўным рэсурсным забеспячэнні, якое зараз ніжэй за нарматыўнае. Такім чынам, залежнасць сельскай гаспадаркі ад міжгаліновых паставак

Табліца 1. **Чаканае павышэнне сабекошту прадукцыі сельскай гаспадаркі пры ўвядзенні новых аптовых цэн на прадукцыю прамысловай вытворчасці і паслугі**

Від прадукцыі	БССР	У тым ліку па абласцях					
		Брэсцкая	Віцебская	Гомельская	Гродзенская	Мінская	Магілёўская
Збожжавыя	90,50	71,60	118,50	87,18	68,02	82,09	115,39
Бульба	178,25	154,60	262,93	155,96	186,19	166,91	189,80
Цукровыя буракі	36,20	36,30	—	—	33,48	39,27	—
Лён (саломка)	330,50	277,40	372,40	266,36	314,67	338,23	340,87
Гародніна	220,90	225,38	180,32	278,69	209,76	201,00	251,00
Малако	120,90	104,70	130,32	132,32	101,22	112,80	151,86
Прыбаўленне па масе:							
буйной рагатай жывёлы	745,20	621,50	758,98	865,66	635,12	714,25	928,06
свіней	827,40	739,70	814,20	1069,23	650,00	791,63	938,32
авечак	1393,30	1125,00	728,57	2371,42	1925,00	1437,50	1925,00
птушак	968,80	898,30	1224,12	1043,40	1027,92	855,31	1179,76
Яйкі	44,23	42,31	47,13	57,24	41,13	36,72	43,08
Воўна	8097,40	8312,50	7843,00	—	8030,30	8280,00	8097,40

узмацніцца. Па-другое, ва ўмовах попыту і прапаноў з-за цэнавых ваганняў, абумоўленых пераходам прамысловых прадпрыемстваў на свабодныя цэны, магчыма зніжэнне даходнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. Па-трэцяе, атрыманне больш высокага даходу прамысловымі прадпрыемствамі можа быць вынікам змянення ацэнкі збыту, асартыменту, якасці прадукцыі. Таму сельская гаспадарка не зможа спыніць ваганні ў цэнах на прамысловую прадукцыю і стабілізаваць попыт. Па-чацвёртае, новыя закупачныя цэны практычна заснаваны на выраўноўванні дадатковых расходаў на набыццё сродкаў прамысловай вытворчасці.

У перспектыве рост фізічнага аб'ёму набытых сродкаў вытворчасці, на якія павышаны цэны, павінен кампенсавацца адпаведным ростам таварнай сельскагаспадарчай прадукцыі. Але аналіз эканамічных вынікаў увядзення новых закупачных цэн паказвае, што маса прыбытку ў грамадскім сектары рэспублікі застанецца ранейшай. Калі ўлічыць, што ўжо працяглы час прадукцыя першай сферы аграпрамысловага комплексу па тэмпах росту перавышае прадукцыю другой сферы прыкладна ў тры разы, то магчымасці расшыранага аднаўлення ў сельскай гаспадарцы будуць абмежаваны.

Акрамя таго, ва ўмовах манапольнага становішча вытворцы аптовыя цэны ў аснове сваёй маюць індывідуальныя затраты прамысловага прадпрыемства. Пры такой тэндэнцыі павышаныя закупачныя цэны перастануць пакрываць дадатковыя расходы, звязаныя з набыццём прамысловых сродкаў вытворчасці. Паколькі дзяржава выступае не так справядлівым гарантам эквівалентнасці абмену паміж незалежнымі рыначнымі партнёрамі, як з'яўляецца зацікаўленым пакупнікам, неабходна захаваць грамадскі кантроль над цэнамі і дамагчыся іх справядлівага рэгулявання з боку дзяржавы-пакупніка.

Асноўнай задачай дзяржаўнага рэгулявання павінна стаць падтрымка ўзроўню даходаў у сельскай гаспадарцы, забеспячэнне для яе адноўкавых эканамічных умоў абмену з галінамі першай сферы АПК. Для гэтага неабходна вызначаць дынаміку цэн, тарыфаў, расцэнак на перададзеныя сельскай гаспадарцы сродкі вытворчасці і зробленыя для яе паслугі, вымяраць дынаміку закупачных цэн, выяўляць цэнавы парытэт і рэгуляваць яго. Парытэт цэн павінен гарантаваць пастаянства даходаў вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі і адначасова даваць магчымасць ім набываць сродкі вытворчасці і забяспечваць паслугі.

Для дзяржаўнага цэнавага рэгулявання неабходна выкарыстаць парытэтныя цэны. Для характарыстыкі пакупной якасці ўсёй сельскагас-